ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
10.06.2020 № 124

# Вучэбная праграма факультатыўных заняткаў «Практыкум па беларускай мове» для X, XI класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі

# ГЛАВА 1
# АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Сапраўдная вучэбная праграма факультатыўных заняткаў (далей – вучэбная праграма) прызначана для X, XI класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, і накіравана на паўтарэнне, падагульненне і сістэматызацыю звестак па фанетыцы, лексіцы, словаўтварэнні, граматыцы, стылістыцы, тэксту, арфаграфіі і пунктуацыі.

2. Вучэбная праграма разлічана на 2 гады (па 35 гадзін у год, 1 гадзіна на тыдзень).

3. Мэта – сістэматызацыя і паглыбленне ведаў і ўменняў па беларускай мове на аснове вывучанага ў V–IX класах і падрыхтоўка вучняў да выпускнога экзамену і цэнтралізаванага тэсціравання.

4. Задачы:

замацаваць і паглыбіць веды, развіць аналітыка-сінтэтычныя ўменні вучняў па раздзелах “Фанетыка і графіка”, “Лексіка. Фразеалогія”, “Марфемная будова слова. Словаўтварэнне”, “Марфалогія”, “Сінтаксіс”, “Маўленне”;

скарэктаваць найбольш тыповыя для вучняў адхіленні ад лексіка-граматычных і вымаўленчых нормаў беларускай літаратурнай мовы;

удасканальваць арфаграфічную і пунктуацыйную пісьменнасць вучняў;

замацаваць і пашырыць веды вучняў пра тэкст, удасканальваць навыкі пабудовы тэкстаў;

садзейнічаць актыўнаму авалоданню функцыянальнымі стылямі маўлення з адначасовым пашырэннем ведаў вучняў аб стылях, іх прыкметах, правілах выкарыстання;

забяспечыць практычнае выкарыстанне лінгвістычных ведаў і ўменняў у маўленчай практыцы;

удасканальваць навыкі выканання тэставых заданняў;

садзейнічаць развіццю культуры маўлення і мыслення вучняў, паглыбленню іх лінгвакультуралагічнай кампетэнцыі;

развіваць сродкамі мовы інтэлектуальную, эмацыйную, эстэтычную, маральную сферы навучэнцаў, іх высокую духоўнасць.

5. Рэкамендаваныя метады і прыёмы навучання і выхавання: паведамленні настаўніка і вучняў з прапановай скласці план або канспект, гутаркі, дыспуты, урокі-камунікацыі, каманднае абмеркаванне, круглыя сталы, самастойная праца; лінгвістычныя разборы, складанне падагульняльных зводных схем і табліц, якія забяспечваюць класіфікацыю матэрыялаў; састаўленне алгарытмаў прымянення правілаў; падагульняльная праца з самастойна

падрыхтаванымі канспектамі тэорыі (падзяліць канспект на лагічныя часткі, падабраць загалоўкі, саставіць паказальнік у канцы сшытка і інш.); падрыхтоўка дакладаў, рэфератаў, аглядаў, анатацый, рэцэнзій, выступленні з паведамленнямі; напісанне сачыненняў на лінгвістычныя тэмы; выкананне тэставых работ і інш.

Мэтазгодна спалучаць франтальныя, групавыя, парныя і індывідуальныя формы навучання.

Выбар форм і метадаў навучання і выхавання вызначаецца настаўнікам самастойна на аснове мэт і задач вывучэння пэўнай тэмы, сфармуляваных у вучэбнай праграме патрабаванняў да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў.

6. Вучні, якія асвоілі змест вучэбнай праграмы, павінны:

6.1. ведаць:

асноўныя нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы;

прыметы тэксту, умець афармляць тэкст з набору сказаў;

тыпы маўлення, іх тыповыя кампазіцыйныя схемы;

стылі маўлення, іх асноўныя прыметы;

значэнні фразеалагізмаў, правільна выкарыстоўваць іх у маўленні, вызначаць сінтаксічную ролю;

марфемную будову слова і асноўныя спосабы ўтварэння слоў у беларускай мове;

асноўныя прыметы часцін мовы, іх граматычныя формы, значэнні, катэгорыі;

сінтаксічныя прыметы складаных сказаў, правільную пастаноўку знакаў прыпынку ў іх;

спосабы перадачы чужога маўлення, правільнае афармленне яго на пісьме;

6.2. умець:

адрозніваць гукі і літары, устанаўліваць адпаведнасць паміж гукамі і літарамі;

адрозніваць мнагазначныя словы і словы-амонімы;

устанаўліваць віды сінтаксічнай сувязі ў словазлучэннях;

вызначаць тыпы простых сказаў паводле мэты выказвання, інтанацыі і будовы;

правільна ставіць знакі прыпынку ў простым сказе;

6.3. валодаць:

асноўнымі нормамі сучаснай беларускай мовы.

## ГЛАВА 2
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### X клас, 35 гадзін

## Маўленне (5 гадзін)

Паняцці “мова” і “маўленне”.

Культура вуснага і пісьмовага маўлення. Нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

Тэкст, яго асноўныя прыметы. Спосабы і сродкі сувязі сказаў і частак у тэксце.

Тыпы маўлення, тыповыя кампазіцыйныя схемы.

Функцыянальныя стылі маўлення (сфера выкарыстання, мэта і задачы выказвання, асноўныя стылявыя рысы, характэрныя моўныя сродкі, асноўныя жанры).

## Фанетыка і арфаэпія. Графіка і арфаграфія (10 гадзін)

Фанетычныя асаблівасці і арфаэпічныя нормы беларускай мовы.

Склад. Складападзел. Націск.

Прынцыпы беларускага правапісу.

Напісанні, заснаваныя на фанетычным прынцыпе.

Напісанні, заснаваныя на марфалагічным прынцыпе.

Правапіс мяккага знака і апострафа.

Правапіс вялікай літары.

Праверачны дыктант.

## Лексікалогія. Фразеалогія (5 гадзін)

Дакладнасць ужывання слова.

Адназначныя і мнагазначныя словы. Прамое і пераноснае значэнні слова.

Сінонімы. Антонімы. Амонімы.

Лексічныя нормы.

Фразеалагізмы, іх ужыванне ў маўленні.

Пісьмовы пераказ тэксту.

## Марфемная будова слова. Словаўтварэнне (3 гадзіны)

Марфемы як структурна значымыя часткі слова.

Правапіс прыставак. Правапіс ы, і, й пасля прыставак.

Спосабы ўтварэння слоў. Складаныя і складанаскарочаныя словы, іх утварэнне і правапіс.

Словаўтваральныя нормы.

Тэставая работа.

## Марфалогія і арфаграфія (9 гадзін)

Часціны мовы як лексіка-граматычныя разрады слоў. Самастойныя і службовыя часціны мовы. Пераход слоў адных часцін мовы ў іншыя.

Назоўнік. Лексіка-граматычныя разрады назоўнікаў. Род назоўнікаў. Лік назоўнікаў. Асновы назоўнікаў. Правапіс канчаткаў і суфіксаў назоўнікаў. Правапіс складаных назоўнікаў.

Прыметнік. Лексіка-граматычныя разрады прыметнікаў. Правапіс канчаткаў і суфіксаў прыметнікаў. Правапіс складаных прыметнікаў.

Лічэбнік. Групы лічэбнікаў паводле будовы, значэння і граматычных прымет. Скланенне і правапіс лічэбнікаў.

Займеннік. Разрады займеннікаў і іх ужыванне. Асаблівасці скланення і правапісу займеннікаў.

Дзеяслоў. Інфінітыў. Правапіс асабовых канчаткаў і суфіксаў дзеясловаў. Утварэнне, правапіс і ўжыванне асобых формаў дзеяслова (дзеепрыметніка і дзеепрыслоўя).

Прыслоўе. Правапіс прыслоўяў і спалучэнняў, блізкіх да іх.

Часціца. Ужыванне і правапіс часціц не (ня), ні з рознымі часцінамі мовы.

Марфалагічныя нормы.

Праверачны дыктант.

### Падагульненне вывучанага (2 гадзіны)

Напісанне выніковага тэста і яго аналіз.

### Рэзерв вучэбнага часу (1 гадзіна)

## XI клас, 35 гадзін

### Паўтарэнне вывучанага ў X класе (4 гадзіны)

Напісанне тэста і яго аналіз.

### Сінтаксіс і пунктуацыя. Словазлучэнне (4 гадзіны)

Словазлучэнне. Віды сінтаксічнай сувязі слоў у словазлучэнні і сродкі яе выражэння.

Некаторыя асаблівасці дапасавання і кіравання ў беларускай мове.

### Просты сказ (12 гадзін)

Сказ як сінтаксічная адзінка. Тыпы сказаў паводле мэты выказвання, інтанацыі і будовы.

Галоўныя і даданыя члены сказа.

Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам.

Аднародныя члены сказа, знакі прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі.

Адасобленыя члены сказа, знакі прыпынку ў сказах з адасобленымі членамі.

Зваротак. Знакі прыпынку пры зваротках.

Пабочныя і ўстаўныя канструкцыі, знакі прыпынку ў сказах з пабочнымі і ўстаўнымі канструкцыямі.

Тэставая работа.

### Складаны сказ (10 гадзін)

Складаназлучаныя сказы, знакі прыпынку ў іх.

Складаназалежныя сказы, знакі прыпынку ў іх.

Бяззлучнікавыя складаныя сказы, знакі прыпынку ў іх.

Складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак, знакі прыпынку ў іх.

Спосабы перадачы чужога маўлення, знакі прыпынку.

Пісьмовы пераказ тэксту.

### Падагульненне вывучанага (4 гадзіны)

Напісанне тэста па сінтаксісе і пунктуацыі, яго аналіз.

Выніковы тэст, яго аналіз.

### Рэзерв вучэбнага часу (1 гадзіна)